№ 96 (3837)

6 снежня 2013 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

АКТУАЛИИ



Светлана КАЛИНКИНА

Пугало

Мы долго тешили себя мыслью, что с чем-чем, а с репутацией у белорусов и Беларуси все в порядке. Героический и трудолюбивый народ, наследники героев-партизан, смелые, достойные, уважаемые соседями люди и так далее и тому подобное. Однако то, как мы сами воспринимаем себя и как окружающие воспринимают нас, это совсем не одно и то же.

В темной комнате поставили табуретку с вбитым гвоздем, торчащим острием вверх, и по очереди запустили туда русского, украинца и белоруса. Русский сел на гвоздь, вскочил и давай матом ругаться! Украинец сел на гвоздь, вскочил, нащупал гвоздь, вытащил его и положил в карман: «В хозяйстве пригодится». Белорус сел на гвоздь, привстал... и со словами «А можа, так і трэба?» снова сел.

Как вы поняли, это анекдот. Достаточно обидный для нас, белорусов. Хотя наше умение притерпеться подмечено очень точно. Причем не институтами и исследовательскими центрами подмечено, а людской молвой.

Чем и как эта молва регулируется, какие аргументы принимает, какие отвергает — непонятно. Но итогом является именно репутация — государства, нации, конкретного человека. Вот сейчас белорусские журналисты поехали в бурлящий Киев. И что услышали? *«Это белорусы могут сдаться, как только им один раз пригрозят из Кремля. Мы до последнего будем стоять»,* — гордо говорят на Майдане.

Конечно, можно спорить. Украина была в шоке после разгона палаточного лагеря на Майдане, хотя итогом этого разгона стали 35 задержанных и отпущенных после составления протоколов да пару десятков человек с разбитыми носами. В Минске же бывали периоды, когда в СИЗО после разгона акций протеста одновременно находилось по пятьсот-семьсот, по тысяче человек. Причем наши силовики за немотивированное применение силы получали не нагоняи, как в Украине, а звезды на погоны. Так что легко им там, в Киеве, считать себя смелыми, а нас — трусами. Но ведь считают. А значит, такая у нас репутация.

С другой стороны, наметилась еще одна тенденция.

Когда в Казахстане в декабре 2011 года были беспорядки нефтяников в городе Жанаозен, многие тамошние сайты сообщали, что к подавлению протестов будет привлечен белорусский спецназ. Оппозиционное “Социалистическое сопротивление Казахстана” даже принимало обращение к белорусскому народу, призывая нас не позволить белорусским бойцам вмешиваться в конфликт.

Теперь история повторилась в Украине. Когда два дня назад в Киев из Минска поездом приехала группа высокопоставленных милицейских начальников, заговорили о том, что в жестоких разгонах, скорее всего, участвуют белорусы.

Что это значит? Зачем Киеву или Астане привлекать к подавлению реальных беспорядков белорусский спецназ, весь “героизм” которого — в избиении безоружных и мирно настроенных интеллигентов? Скорее всего наши молодцы ни к событиям в Жанаозене, ни к событиям в Киеве никакого отношения не имеют. Тем не менее уже нельзя не заметить, что как только где-то возникает конфликт, в ходе которого милиция и спецподразделения начинают проявлять бессмысленные зверства, то вспоминают именно о белорусах. То есть даже за пределами родной страны у белорусского спецназа репутация карателей.

Впрочем, у Беларуси как государства репутация не лучше.

“Чтобы не случилось, как в Беларуси!” — на постсоветском пространстве это теперь самый распространенный аргумент, означающий: “Так делать нельзя”.

В России власти начали мухлевать с выборами — десятки тысяч людей вышли на площадь, “чтобы не случилось, как в Беларуси”.

В Киеве бесчинствовала милиция — все политические силы потребовали возбуждения уголовного дела в отношении милиционеров, “чтобы не случилось, как в Беларуси”.

В Грузии правительство начало заигрывать с электоратом, раздавая незаработанные деньги — МВФ, Всемирный банк, экономические консультанты и советники встали на дыбы, “чтобы не случилось, как в Беларуси”...

Наша страна стала пугалом. Наша власть стала пугалом. Белорус, притерпевшийся сидеть на гвозде, тоже стал пугалом, символом бесправия и трусости. И на чужой роток платок не накинешь...

ХТО ЁСЦЬ ХТО

Аляксандр ***МЯЖУЕЎ,***
Дзяржсакратар Савета бяспекі:



«Ніколі не любіў агаляць шашку»

5 снежня прэзідэнт падпісаў указ аб тым, што Савет бяспекі краіны ўзначаліць генерал-маёр, старшыня рэспубліканскага савета Беларускага саюза афіцэраў ***Аляксандр Мяжуеў.***

Мяжуеў перабраўся ў Мінск з Гродна ўсяго некалькі гадоў таму, стаў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў 5-га склікання. У парламенце заняў пасаду старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па нацыянальнай бяспецы. Цікавы факт: Мяжуеў быў самым багатым кандыдатам у дэпутаты. Яго гадавы даход напярэдадні выбараў складаў 33 тысячы долараў.

У нешматлікіх інтэрв’ю Мяжуеў прызнаваўся, што для падтрымкі нацыянальнай бяспекі краіны *“важна своечасова і аператыўна ўстараняць “болевыя кропкі”, асабліва ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва жылля, стварэння працоўных месцаў”*. Але генерал-маёр супраць сацыяльнага ўтрымanства. Ён не падтрымлівае прапановы аб узмацненні пакарання за хабарніцтва, стварэнні кантрактнай арміі, але лічыць, што на вайсковую службу можна прымаць жанчын.

Пра сябе спадар Мяжуеў кажа няшмат: у меру амбіцыёзны, актыўны.

“Ніколі не любіў агаляць шашку. Спачатку сто разоў адмераю”, — выказаўся ў размове з гродзенскай рэгіянальнай газетай “Перспектива” Мяжуеў.

ДАСЬЕ

Аляксандр Мяжуеў нарадзіўся 11 ліпеня 1959 года ў Ляхавічах Брэсцкай вобласці. Скончыў Кіеўскае вышэйшае агульнавайсковае каманднае вучылішча, Ваенную акадэмію імя М.В.Фрунзе ў Маскве; Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі. Мае званне генерал-маёра.

Праходзіў службу на камандных і штабных пасадах: камандзіра брыгады, намесніка камандуючага войскамі аператыўнага камандавання, начальніка штаба — першага намесніка камандуючага аператыўнага камандавання, камандуючага войскамі аператыўнага камандавання, начальніка Галоўнай ваеннай інспекцыі Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь. Член калегіі Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны 20 медалямі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Жанаты, мае трох сыноў, унукаў.

АНОНС

Радзім ГАРЭЦКІ:

«Каханне трэба песціць і насіць на руках...»



7 снежня славуты геолаг, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, літаратар і грамадскі дзеяч Радзім ГАРЭЦКІ адзначае 85-гадовы юбілей.

(Інтэрв'ю з Радзімам Гарэцкім чытайце на 2-й стар.)

АСАБІСТАЯ СПРАВА

Радзім ГАРЭЦКІ. *Нарадзіўся 7 снежня 1928 г. у Мінску. Беларускі вучоны-геолаг, грамадскі дзеяч.*

У 1972 г. быў абраны членам-карэспандэнтам, а ў 1977-м — акадэмікам АН БССР. З 1992-га па 1997 г. працаваў віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі.

З 1990 Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі сябра Рады, а з 1993 г. прэзідэнт МГА "Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына”. Актыўна працаваў з беларускай дыяспарай, быў адным з арганізатараў з’ездаў беларусаў свету.

Член рады ГА “Таварыства беларускай мовы”, Беларускага фонду культуры, выдаў некалькі кніг.

НА СВАБОДУ!

Ксёндз Уладзіслаў Лазар пакінуў “амерыканку”

Ксяндза Уладзіслава Лазара вызвалілі са следчага ізалятара КДБ гэтак жа нечакана, як і затрымалі.

Нагадаем, што затрыманне адбылося 30 мая. Але пра тое, што за кратамі апынуўся каталіцкі святар, стала вядома толькі ў ліпені. Прычым і пасля гэтага не было адказу на пытанне: “За што?” Спачатку хадзілі чуткі, што менавіта пра ксяндза Лазара гаварыў Аляксандр Лукашэнка, калі расказваў пра шпіёна, якога злавіў КДБ. Потым з’явілася афіцыйная інфармацыя аб тым, што ксёндз не шпіён, але праз яго нібыта перадаваліся нейкія грошы. Доказы, праўда, так і не былі абнародаваны, хаця час ішоў. Тое, што на ксяндза Лазара аказваецца ціск, стала зразумела пасля таго, як у ізалятар не дазволілі перадаць святару нават Біблію і ружанец.

Вернікі, якія ведалі ксяндза Уладзіслава Лазара, як адзін выказваліся ў яго падтрымку і заяўлялі, што не вераць у “шпіёнскую справу”. У касцёлах штодня адбываліся малітвы за вызваленне святара. “Хрысціянская ініцыятыва” і аргкамітэт па стварэнні партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя” абвясцілі збор подпісаў з патрабаваннем вызвалення, і першыя пяць тысяч сабралі літаральна за пару дзён. Прычым пад зваротам у КДБ і Генеральную пракуратуру падпісваліся не толькі каталікі. Прадстаўнікі інтэлігенцыі накіравалі свой зварот у сілавыя структуры і таксама запатрабавалі: “Вызваліць!”.

Распачалася кампанія салідарнасці з арыштаваным ксяндзом. Людзі штодня маліліся за яго каля Чырвонага касцёла, збіраліся грошы на абарону і перадачы, у следчы ізалятар на імя Уладзіслава Лазара пайшлі сотні паштовак. Некалькі грамадскіх арганізацый накіравалі зварот у міжнародныя праваабарончыя структуры, каб святара прызналі вязнем сумлення. І ў гэты момант, 3 снежня, раптам стала вядома, што Уладзіслава Лазара выпусцілі з “амерыканкі”.

Праўда, адбылося гэта ў своеасаблівай форме: з КДБ патэлефанавалі папскаму нунцыю Клаўдзіа Гуджэроці і папрасілі забраць ксяндза з ізалятара. Цікава, што званок быў не сваякам, не адвакатам, а менавіта папскаму нунцыю. Праўда, усе задаволены, што ўвогуле адбылося вызваленне, і нават не галоўнае, у якой форме і на якіх умовах. Можна сабе ўявіць радасць бацькоў, якія баяліся, што не дажывуць да таго моманту, калі ўбачацца з сынам. Аднак 4 снежня доўгачаканая сустрэча ўсё ж такі адбылася.

Сястра Уладзіслава Лазара Яніна кажа: *“Бацькі, як толькі яго ўбачылі, расплакаліся. Такая радасць!.. Ён, канешне, моцна схуднеў, але вочы зіхацяць. Быў вельмі ўсцешаны тым, што столькі людзей, якіх ён нават і не ведае асабіста, прыкладалі намаганні, каб яго вызваліць. Казаў, што вельмі ўдзячны ўсім. Мы таксама вельмі ўдзячны людзям, якія не засталіся абыякавымі да нашай бяды”.*

Уладзіслаў Лазар знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Ён не можа пакідаць межы Беларусі і павінен ставіць у вядомасць адпаведныя органы пра ўсе свае перамяшчэнні па краіне. Яму таксама забаронена мець зносіны з журналістамі. Калі вярстаўся нумар, яшчэ не было вызначана, у якім канкрэтна месцы будзе жыць святар, але, напэўна, не па месцы прапіскі. Пікантнасць сітуацыі ў тым, што Уладзіслаў Лазар афіцыйна прапісаны... у касцёле Мар’інай Горкі.



Любоў ЛУНЁВА.

ФАКТ І КАМЕНТАРЫЙ

Ці не паплыве ў Беларусь “левая” расійская гарэлка?

У Беларусі з 2015 года можа быць адменена выключнае права дзяржавы (інстытут спецімпарцёра) на ўвоз алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў.

У прыватнасці, падрыхтаваны законапраект аб унясенні змяненняў у закон «Аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці і абароту алкагольнай, нехарчовай прадукцыі з утрыманнем спірту і нехарчовага этылавага спірту», паводле якога прадугледжана адмена выключных правоў дзяржавы на ажыццяўленне імпарту алкагольных напояў з 1 студзеня 2015 года, інфармуе БелаПАН.

Як паведаміла крыніца ў дзяржорганах, Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову па выключэнні алкагольнай прадукцыі са спісу выняткаў і іншых абмежаванняў (у тым ліку бар’ераў) узаемнага доступу суб’ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці на рынак дзяржаў — членаў Мытнага саюза. Падрыхтаваны таксама праект прэзідэнцкага дэкрэта, які прадугледжвае адмену выключных правоў дзяржавы на ажыццяўленне імпарту тытунёвай сыравіны і тытунёвых вырабаў з 1 студзеня 2015 года.

“У Расіі праблема заключаецца ў тым, што “левую” гарэлку прадаюць па коштах ніжэйшых, чым легальныя вытворцы, — каментуе “Народнай Волі” эканаміст **Леанід ЗЛОТНІКАЎ**. — *Там жа гэтыя тавары не пад кантролем дзяржавы. Таму вось пытанне: ці не паплыве “левая” расійская гарэлка і ў Беларусь? Хоць, думаю, беларуская дзяржава будзе трымаць сітуацыю ў руках. Гандаль тытунём і гарэлкай — гэта ж курыца, якая нясе залатыя яйкі”.*

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПАЕХАЛІ!

Паліва падаражэла

У сярэднім у год аўтааматар, які запраўляе сваё аўто 92-м бензінам і праязджае ў дзень 50 км, траціць крыху больш за 10 мільёнаў рублёў.

Учарашняе падаражанне паліва — чацвёртае на працягу года. “*Перагляд коштаў выраблены ў сувязі са змяненнем курсу беларускага рубля ў адносінах да замежных валют”,* — адзначаецца на афіцыйным сайце “Белнафтахіма”.

Па неафіцыйнай інфармацыі, дадзенае павышэнне не апошняе ў гэтым годзе. На АЗС кажуць, што да канца года кошты на паліва вырастуць яшчэ на 5%.

Як павышаліся кошты на паліва ў 2013 годзе:

	16.01.2013	03.09.2013	17.09.2013	**05.12.2013**
АІ-92	7400	7800	8400	**8600**
АІ-95	7800	8300	9100	**9300**
Дызпаліва	8000	8500	9200	**9400**

Дарэчы, эканамісты падлічылі, колькі ў сярэднім у год абыходзіцца аўтааматарам паліва для аўто. Напрыклад, калі кіроўца штодня праязджае 50 км, запраўляе машыну 92-м бензінам, то з улікам усіх падаражанняў паліва ў 2013-м ён расходуе ў год прыблізна 10 мільёнаў 907 тысяч рублёў.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

ЧУЛІ?

Пагроза канфіскацыі аўто не спыняе п’яных кіроўцаў

З 24 кастрычніка, адразу пасля ўступлення ў сілу паправак у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях узмацнення мер адказнасці за кіраванне транспартным сродкам у стане ап’янення, у Мінску назіраўся своеасаблівы перыяд зацішша: выяўляліся адзінкавыя выпадкі кіравання аўтамабілем у нецвярозым стане.

«Такая сітуацыя доўжылася каля тыдня, — паведаміла кіраўнік прэс-службы ДАІ Мінска **Таццяна Харлінская,** *— а потым мы вярнуліся да тых лічбаў, якія фіксаваліся да ўступлення паправак у сілу: кожныя суткі ў Мінску выяўляецца прыкладна 10—15 нецвярозых кіроўцаў».*

ТРАГЕДЫЯ

У Емене загінуў брат рэжысёра Валерыя Мазынскага

Ён быў адным з двух ваенных дарадцаў у Міністэрстве абароны Емена, на якіх у лістападзе здзейснілі напад баевікі “Аль-Каеды”.

Як паведаміла кітайскае агенцтва “Сіньхуа”, забойства адбылося побач з гатэлем, дзе пражывалі ваенныя дарадцы. Нападаючы адкрыў агонь, праязджаючы міма ахвяр на матацыкле, калі яны пакідалі будынак гатэля. Адзін з іх сканаў на месцы — раненне ў вобласць галавы было смяротным. Другі памёр на шляху ў бальніцу ад ранення ў вобласці шыі.

Кіраўнік Дзяржкамваенпрама Беларусі **Сяргей Гурулёў** заявіў, што грамадзяне Беларусі, якія загінулі ў афрыканскай краіне, працавалі па кантракце, які беларускі бок заключыў з Мінабароны Емена. Адным з загінуўшых быў родны брат вядомага беларускага рэжысёра Валерыя Мазынскага. Ён расказаў, што цела брата даставілі на радзіму толькі ў чацвер, 5 снежня. Аб абставінах трагедыі яму вядома не больш, чым астатнім.

— *Якія абставіны...* — уздыхнуў Валерый Яўгенавіч. — *Вы ж чыталі, што напісана. А хто нам скажа нейкую іншую інфармацыю?..*

Якую менавіта работу ў Емене выконваў брат Валерыя Мазынскага, невядома. Рэжысёр паведаміў толькі, што ездзіў брат туды на працягу года і да сваёй трагічнай смерці правёў у Емене месяц.

Рэдакцыя “Народнай Волі” выказвае спачуванні сям’і і блізкім загінуўшага.

Марыя МАЛЕВІЧ.

УВАГА!

На Беларусь ідзе «Хавер»



«6 снежня на тэрыторыі краіны чакаюцца складаныя ўмовы надвор’я: снег, мяцеліца, узмацненне ветру парывамі да 15—22 метраў у секунду, месцамі да 24 метраў у секунду», — паведамляе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі. На нашу краіну насоўваецца скандынаўскі цыклон, абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі.

Нямецкія метэаролагі далі цыклону імя Xaver. У Еўропе асцерагаюцца, што ён можа прывесці да такіх жа разбурэнняў, як і кастрычніцкі шторм “Святы Іуда”. Аднак беларускія сіноптыкі супакойваюць: цяперашні “Хавер” мае зусім іншую прыроду, хоць далёкія паездкі лепш пры магчымасці адкласці. *“Сакавіцкі “Хавер” быў паўднёвым, больш каварным цыклонам,* — патлумачылі ў беларусім Гідрамецe. — *А цяперашні падсыпле снегу, але не ў такой колькасці. Чакаецца, што вышыня покрыва павялічыцца на 2—6 сантыметраў. Пры гэтым будзе даволі цёпла: ад +3 да -2 градусаў па Цэльсію. Значна больш небяспечны моцны вецер».*

Па дадзеных сіноптыкаў, у суботу ў Беларусі таксама чакаюцца складаныя ўмовы надвор’я. Цыклон будзе перамяшчацца ў бок Смаленскай вобласці і яшчэ акажа ўплыў на надвор’е ў Беларусі.

Згодна з прагнозам, тэмпература паветра на працягу сутак 6 снежня складзе ад -3°С да +2°С, 7 снежня — ад 0°С да -6°С.

ЕСТЬ ВОПРОС!

Приватизация квартир продлится до июля 2016 года?

В исполкомах наблюдается наплыв людей, которые хотят приватизировать свое жилье. В некоторых районах за неделю число обращений доходит до 400.

До какой даты необходимо подать заявление, чтобы успеть оформить приватизацию квартиры?

— Пока проект указа президента не подписан. Но им предусматривается несколько мер, — заявил во время «Прямой линии» в «Комсомольской правде» в Белоруссии» консультант управления жилищного хозяйства Министерства жилищного хозяйства **Константин Куликов**. — Например, планируется, что после 1 июля 2016 года все неприватизированные квартиры, которые были объектами приватизации, перейдут в арендное жилье. Для приватизации служебных жилых помещений проектом установлен срок до 1 апреля 2014 года. То есть речь пока идет об этих датах.

— Хорошо, а по какой стоимости засчитываются чеки «Жилье» для приватизации квартиры в настоящее время?

— Они засчитываются по номинальной стоимости, то есть если на чеке написано 500 рублей, то именно эта сумма и засчитывается в счет погашения стоимости приватизации. Но эта стоимость сопоставляется с ценами жилых помещений в 1991 году. А уже разница между стоимостью чеков «Жилье» и оценочной стоимостью квартиры, исчисленной в ценах 1991 года, переводится в сегодняшние цены.

ФІНАНСЫ

Банкі зніжаюць стаўкі

Многія буйныя беларускія банкі — “Белаграпрамбанк”, “Белінвестбанк”, “Банк ВТБ”, “БПБ-Ашчадбанк” — знізілі стаўкі рублёвых дэпазітаў для фізічных асоб. На пачатак снежня яны склалі 42—45 працэнтаў, у той час як у канцы лістапада даходнасць укладаў у нацыянальнай валюце дасягала 49 працэнтаў гадавых.

У той жа час некаторыя невялікія прыватныя банкі (напрыклад, “Ідэя Банк”) захавалі высокія працэнты па рублёвых укладах, а ў некаторых выпадках нават павялічылі іх, максімальная прапанова сёння даходзіць да 55 працэнтаў гадавых (“Франсабанк”). Эксперты тлумачаць гэта тым, што невялікія банкі не маюць такога свабоднага доступу да рублёвых рэсурсаў Нацбанка, як буйныя банкі.

РЭАЛІІ

Паборы ў дзіцячых садках узаконяць?

Міністр адукацыі **Сяргей Маскевіч**, выступаючы днямі ў парламенце, адзначыў, што сёння ўтрыманне аднаго дзіцяці абыходзіцца дашкольнай установе ў 1,49 мільёна рублёў у месяц пры сярэдняй заработнай плаце работнікаў 2,9 мільёна. *«Лічу, што будзе правільным, калі мы прымем дадатковыя меры нарматыўна-прававога і арганізацыйнага плана па развіцці платных паслуг у дашкольных установах, стымуляванні ўдзелу бацькоў у фінансаванні расходаў дашкольных устаноў»,* — падкрэсліў міністр.

Дарэчы, па словах Маскевіча, кадравы дэфіцыт у дзіцячых садках — адна з сур’ёзных праблем сістэмы адукацыі. На цяперашні момант у дашкольных установах каля 450 вакантных ставак. У тым ліку ў Мінску — 300, у Мінскай вобласці — каля 100.

ПРАГНОЗ

Не хопіць студэнтаў

У бліжэйшыя 5 гадоў вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі будуць адчуваць дэфіцыт абітурыентаў з прычыны неспрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі, якая склалася ў 1990-я гады. «У бліжэйшыя 5 гадоў колькасць абітурыентаў у вышэйшых навучальных установах будзе скарачацца. Калі ў 2013 годзе ў ВНУ паступіла 60,5 тысячы абітурыентаў, то ў бліжэйшыя гады іх чакаецца 50—55 тысяч», — заявіў міністр адукацыі **Сяргей Маскевіч.**

ШЧЫРАЯ РАЗМОВА

Радзім ГАРЭЦКІ: «Каханне трэба песціць...»

У працоўным кабінеце Радзіма Гаўрылавіча паўсюль кнігі. Кажа, што ўжо няма куды і складваць, расказвае пра іх. З маім суразмоўцам наогул размаўляць можна суткамі. Яму на самай справе ёсць што распавесці...

— Радзім Гаўрылавіч, што для вас 85 гадоў? Як успамінаецца дзяцінства, наколькі яркія гэтыя ўспаміны?

— У жыцці было столькі розных момантаў, што ў памяці ўсплываюць нават нечаканыя. Жыццё ў мяне было досыць складанае.

— Вы нарадзіліся, можна сказаць, разам з Беларускай акадэміяй навук...

— Так, і ў ліку першых акадэмікаў абралі майго бацьку Гаўрылу Іванавіча. Ён быў тады дырэктарам Інстытута сельскай і лясной гаспадаркі. Але ў 1930 годзе бацьку арыштавалі, а таксама і дзядзьку — пісьменніка Максіма Гарэцкага. Тату спачатку прыгаварылі да расстрэлу, але пасля саслалі на Салаўкі на 10 гадоў. Там я і правёў сваё дзяцінства. Тагачасныя ўспаміны ўсплываюць дагэтуль. Памятаю, як у Кольскім заліве ў час адліву мы рукамі лавілі камбалу, а з дзедам, маміным бацькам, збіралі цудоўныя ягады... Але былі і непрыемныя, нават жахлівыя моманты. Я рос сярод зняволеных, і не ўсе былі “палітычнымі”. “Уркі” навучылі нас з братам паліць папяросы, лаяцца. Мы былі сведкамі таго, як збягалі зняволеныя. Да гэтага часу ў вачах стаіць карціна. Зняволены ўцёк і схаваўся ў траншэю. Закапаўся ў пясок і задыхнуўся. Сабакі знайшлі яго, выцягвалі з ямы чалавека, які ўжо быў сіні... Вось такія ў мяне кантрастныя ўспаміны. Час быў вельмі няпросты. Бацька пасля гэтага быў яшчэ два разы арыштаваны. А Максіма ў 1938 годзе расстралялі.



1983 год. Дом літаратара. Злева направа: Іван Шамякін, Радзім Гарэцкі, Янка Брыль, Галіна Гарэцкая (дачка Максіма Гарэцкага), Алесь Адамовіч, Максім Танк.

— Ваш бацька быў такі вядомы чалавек...

— А Максім Гарэцкі — яшчэ больш вядомы! Літаратар Антон Адамовіч у сваёй манаграфіі пісаў: “Максім Гарэцкі — пачынальнік сучаснай беларускай прозы”. Нікога не шкадавалі... Вінавацілі іх у “нацдэмаўшчыне”, па сутнасці, забралі за тое, што занадта любілі Беларусь, мову, людзей і імкнуліся, каб краіна была самадастатковай. І забраць было не праблема. Прыдумвалі што заўгодна. Максіма і бацьку вінавацілі ва ўдзеле ў выдуманым Саюзе вызвалення Беларусі. Патрэбна была справа, гучны працэс, як ва Украіне. Янка Купала ў знак пратэсту зрабіў тады сабе харакіры, ускрыў нажом жывот, а кіраўнік Акадэміі навук Ігнатоўскі скончыў жыццё самагубствам. Была скандальная сітуацыя... Прыпісвалі бацьку і ўдзел яшчэ ў адной міфічнай структуры — Працоўнай сялянскай партыі, антысавецкую прапаганду, шпіянаж на карысць Польшчы і Германіі. Гаўрылу Іванавіча поўнасцю рэабілітавалі ў 1958 годзе, а праз год — і Максіма. Колькі тады рэпрэсавалі таленавітых людзей! Я думаю, каб не гэта, то сёння, можа быць, і мы жылі б па-іншаму. У іх было столькі імпэту, столькі жадання зрабіць нашу Беларусь па-сапраўднаму шчаслівай...

— Вы, малы хлопчык, тады разумелі, што адбываецца?

— Я бачыў гора сям’і, трагедыю. Бацьку арыштавалі, маці засталася з намі адна. Са службовай кватэры ў Мінску выгналі, некаторыя адмаўляліся размаўляць з жонкай “ворага народа”, на працу не бралі. Сядзелі галодныя і халодныя.

— Недзе чытаў, што ў вашых бацькоў было вельмі светлае каханне...

— Мне і брату вельмі пашанцавала, што ў нас былі такія бацькі. Маці была з Беластока, тата — з Магілёўшчыны. Яны пазнаёміліся яшчэ студэнтамі. Звычайнае сяброўства перарасло ў сапраўднае каханне, якое прайшло праз усё жыццё.

— Радзім Гаўрылавіч, а калі вы першы раз закахаліся?

— У трэцім класе, калі гэта можна назваць каханнем. Мне вельмі падабалася адна дзяўчынка, і я адчуваў, што я ёй таксама. Але ж мой бацька тады сядзеў у турме, і маці дзяўчынкі не дазваляла нават падыходзіць да сына “ворага народа”. Казала: “Каб я цябе з гэтым гадам не бачыла!” І, ведаеце, раней адносіны паміж хлопцам і дзяўчынай былі не такія, як зараз. Мы да гэтай справы адносіліся больш сур’ёзна.

— У якім узросце вы ажаніліся?

— 23 гады было, акурат інстытут скончыў. Але, шчыра скажу, такога кахання, як у бацькоў, у нас з жонкай не было. У каханні галоўнае не толькі фізіялагічная блізкасць, а яшчэ больш — духоўнае адзінства. Каханне трэба не ганьбіць, а песціць. Насіць на руках, як нейкую зорку. Вось тады яно не тухне.

— Чаму вы больш часу прысвячалі — рабоце ці сямейнаму жыццю?

— Усё ж больш рабоце. І гэта, відаць, ад бацькоў. Да таго ж, як мне падаецца, вельмі важна выбраць прафесію. Калі ў БДУ чытаў лекцыі будучым геолагам, заўсёды казаў: “Тысячу разоў падумайце, ці ваша гэта. Лепш з першага курса сысці, каб затым не было расчаравання”. Я ж выбраў прафесію геолага, як і бацька, і быў вельмі задаволены. Мне падабаліся вандроўкі, гэта была вельмі рамантычная прафесія. А калі нешта падабаецца, то і справа ідзе добра, і вочы гарaць, і ёсць апантанасць да навукі.

— Наколькі, на ваш погляд, сёння апантаныя маладыя беларускія навукоўцы?



1978 год. Радзім Гарэцкі з бацькам Гаўрылам Іванавічам.

— Розныя ёсць, але сёння сітуацыя з моладдзю вельмі кепская. А ў геалогіі — проста катастрафічная. І перш-найперш справа ў фінансах, бо з такімі заробкамі чалавек элементарна не можа пракарміць сваю сям’ю. Людзі атрымліваюць вышэйшую адукацыю, але не ідуць у навуку. Выпускнік лепш уладкуецца ў якую-небудзь фірму. Вось там ён зарабіць! А ў нас... Хіба 2 мільёны — гэта грошы для сталіцы?

— Усяго 2 мільёны?!

— Гэта ў лепшым выпадку. Адзін час даходзіла да смешнага. Аспірант атрымліваў больш, чым малодшы навуковы супрацоўнік. З’язджаюць за мяжу, шукаюць новыя “хлебныя” месцы. Поўны разгон! Дзякуй Богу, што сталых людзей не выганяюць з акадэміі, вось яны зараз і цягнуць усю геалагічную навуку. Сыдуць — будзе правал. Гадоў дзесяць-дваццаць трэба будзе, каб дацягнуць навуку да былога ўзроўню.

— А вам не было прапаноў змяніць месца на больш грашовае?

— Колькі заўгодна. У Расію запрашалі дырэктарам Геалагічнага інстытута, дзе я ў свой час працаваў. Вылучалі на выбары акадэмікам Акадэміі навук СССР, але абралі, калі Саюз ужо развалiўся. Таму я з’яўляюся замежным членам Расійскай акадэміі навук, але грошы там не атрымліваю. У Расіі навукоўцы (і асабліва члены РАН) за званне атрымліваюць непараўнальна больш, чым у нас. Але я адданы сваёй зямлі, роднай Беларусі.

— Нейкі час вы ўзначальвалі Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», шмат робіце для адраджэння роднай мовы і культуры...

— Ведаеце, на беларускай мове я загаварыў, калі ўжо школу заканчваў. Мне давялося змяніць 13 школ, пакуль качавалі па Расіі. Ды і ў Беларусь вярнуўся толькі праз 40 гадоў. З 1993 да 2001 года я быў прэзідэнтам Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», а членам Рады з’яўляюся ад яго стварэння да гэтага часу. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні ўсіх шасці з’ездаў беларусаў свету.

— А якой бы вам хацелася бачыць Беларусь?

— Незалежнай. Дэмакратычнай. І абавязкова — беларускай Беларуссю. На першае месца трэба ставіць родную мову, культуру, навуку. Без мовы не будзе краіны. І дыягназ сённяшняй уладзе можна паставіць адзін — антыбеларускі. Мову амаль не падтрымлівае, літаратуру, культуру — мала... А да чаго адукацыю давялі! Шчыра скажу — сорамна за дзяржаву. Без нацыянальнай культуры, літаратуры, навукі, адукацыі, высокаразвітай эканомікі немагчыма пабудаваць незалежную дзяржаву.

— Радзім Гаўрылавіч, у 85 гадоў вы выглядаеце выдатна. Актыўны, творчы, аптымістычны...

— Я вам скажу больш — да 70 гадоў я наогул практычна не хварэў. Але пасля здарыўся інфаркт, я атрымаў прафесійны, моцны ўдар па галаве, калі ішоў дадому... Адным словам, здароўе пахіснулася, зараз цэлы букет розных хвароб. А што дапамагае падтрымліваць сілы? Першае — добрыя гены. Родныя па маці жылі больш за 90 гадоў. Бацька памёр у 88 гадоў, але пасля турмаў і так дзівіліся, як ён дацягнуў да гэтага часу. Маці і тата былі нязлоснымі, жыццялюбнымі, незайздроcлівымі. Я гэтыя прынцыпы таксама сабе ўзяў, і гэта насамрэч дапамагае жыць. Колькі разоў бачыў, што зайздрасць, як іржа, з’ядае чалавека. Трэба мець любоў да жыцця, старацца быць добрым, працавітым, аптымістычным. Вельмі дапамагаюць падтрымка і разуменне жонкі. Нягледзячы на цяжкі стан сучаснай навукі, асабліва геалогіі, мяне радуе, што я па-ранейшаму магу займацца навукай, мець добрых сяброў — цікавых людзей, бачыць цудоўную нашу прыроду.

— Ці перакуліце чарку на юбілей? Можаце сабе яшчэ дазволіць?

— Раней я гэта рабіў з прыемнасцю, але зараз дактары зусім забаранілі алкаголь. Так што ў лепшым выпадку прыкладу да вуснаў адну чарачку. Дарэчы, за ўсё сваё жыццё я напіваўся, можа быць, разы два. А бацька наогул не піў. Гарэлка шмат творчых людзей згубіла...

— Як збіраецеся адзначаць 85-годдзе?

— Хацелася б як мага цішэй, бо святкаванне такой даты больш нагадвае мне рэпетыцыю праводзінаў на той свет. Прабачце за чорны гумар... Але з прыемнасцю буду прымаць віншаванні.

Алесь СІВЫ.

Фота аўтара і з сямейнага архіва Радзіма Гаўрылавіча Гарэцкага.

РЭГІСТРАТУРА

А врачей спросили?

Вчера министр здравоохранения Василий Жарко представил в Палате представителей проект изменений и дополнений, которые Минздрав предлагает внести в закон «О здравоохранении». Среди предложений — обязать органы исполнительной власти, юридических и физических лиц больше заниматься профилактикой заболеваний. *«Будем чаще проводить профилактические осмотры. Если на диспансеризацию сейчас приходят 60—70% трудящихся, мы добьемся, чтобы приходили от 94% до 100%. Ста процентов мы все равно не добьемся, но будем более активны в плане профилактики»,* — отметил министр.

Как подчеркнул Василий Жарко, к увеличению очередей в поликлиниках это не должно привести, поскольку профилактическая работа будет проводиться разумно. «Летом в поликлиниках спокойнее, никаких нагрузок нет. Участковые терапевты и педиатры больше всего загружены в осенне-зимний период, когда идет подъем заболеваемости».

Любопытно, что когда в 2008 году диспансеризация вернулась в нашу жизнь, оценку ей поставили сами врачи. Институт социологии НАН Беларуси совместно с профсоюзом работников здравоохранения провел тогда социсследование, в ходе которого выяснилось, что проведенную диспансеризацию положительно оценили только 9% врачей, 31% — неудовлетворительно, остальные 60% — удовлетворительно. В ответах медиков не подвергалась сомнению сама идея раннего выявления заболеваний и их своевременного лечения, но вот как она будет проводиться — врачей настораживало.

— По мнению врачей, всеобщая диспансеризация не приводит к желаемому результату, — отмечали тогда в профсоюзе работников здравоохранения. — Врачи считают, что диспансеризация должна быть прежде всего правом и ответственностью граждан за свое здоровье, более адресной, нацеленной на конкретное заболевание либо на конкретную возрастную или профессиональную группу.

Одним словом, не очередной галочкой.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

МЕДДАВЕДКА

Прышчэпку ад грыпу яшчэ можна зрабіць

У Мінску завяршылася масавая імунізацыя насельніцтва супраць грыпу. *“Разам з тым у шэрагу паліклінік горада вакцыны яшчэ засталіся. У тых, хто не паспеў па якіх-небудзь прычынах зрабіць прышчэпку, такая магчымасць яшчэ ёсць»,* — растлумачыла загадчыца эпідэміялагічнага аддзела Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі **Ірына Глінская.**

На дадзены момант прышчэпку зрабілі больш за 670 тыс. чалавек, або 35,8 працэнта насельніцтва. За кошт бюджэтных сродкаў магчымасць вакцынацыі супраць грыпу выкарысталі каля 566 тысяч мінчан. За кошт асабістых сродкаў прышчэпку ад грыпу зрабілі амаль 11 тысяч чалавек.

Прадпрыемствы аплацілі вакцынацыю супраць грыпу для 102,6 тысячы работнікаў. У бягучым сезоне сталічныя арганізацыі больш актыўна ўключыліся ў працэс імунізацыі, асабліва тыя з іх, хто меў такі вопыт у мінулыя гады, адзначыла Ірына Глінская. Іх кіраўнікі пераканаліся ў значным эканамічным эфекце ад вакцынацыі работнікаў супраць грыпу. Праведзены на такіх прадпрыемствах маніторынг паказаў зніжэнне паказчыкаў захворвання з часовай стратай працаздольнасці.

ЧУЛІ?

Дэпутат Шылава прапануе...



У вышэйшай школе неабходна пачаць пераход з бюджэтнага фінансавання да бюджэтнага субсідзіравання.

Такую прапанову падчас парламенцкіх слуханняў у Палаце прадстаўнікоў выказала намеснік старшыні пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы **Святлана Шылава.**

«Дзяржава будзе заказваць у ВНУ месцы па запатрабаваных спецыяльнасцях, студэнт, выбіраючы замоўленае месца, атрымлівае беспрацэнтны крэдыт, які будзе пагашаны дзяржавай пасля адпрацоўкі студэнтам па размеркаванні», — патлумачыла Святлана Шылава.

Калі ў працэсе навучання студэнта адлічылі або ён не адпрацаваў неабходнага тэрміну, то хай сам пагашае гэты крэдыт, лічыць народная выбранніца.

СІТУАЦЫЯ

Вайна са свіннямі: этап другі

Амаль паўгода ў краіне не сціхаюць жарсці з-за афрыканскай чумы свіней. І днямі распачаўся новы этап гэтай кампаніі.

То ў адным, то ў другім мястэчку сяляне спрабуюць супрацьстаяць нават не эпідэміі, а чыноўнікам, якія аддаюць загады знішчыць пагалоўе ў прыватных гаспадарках.

Нагадаем, што “Народная Воля” распавядала пра лакальны канфлікт у Валожынскім, Бярозаўскім, Кобрынскім ды іншых раёнах. Спецыялісты, ветэрынарныя і санітарныя ўрачы выказалі свае меркаванні наконт прынятых захадаў і інструкцый у мэтах барацьбы з эпідэміяй. Былі крытычныя выказванні і наконт таго, што свінакомплексы будавалі блізка ад вёсак, не звяртаючы ўвагі на пратэсты мясцовых жыхароў, а потым прымусілі сялян знішчаць свіней, калі іх гаспадаркі патрапілі ў 5-кіламетровую зону ад комплексу. Людзі, далёкія ад “ветэрынарнай тэмы”, сталі разбірацца ў санітарных нормах, ва ўжытак увайшлі тэрміны "каранцін", "першая і другая пагражальныя зоны" і г.д. Людзі абураліся інструкцыямі, але знешне выглядала, што яны пацiху змірыліся і пакорліва пагадзіліся на забой хатняй жывёлы.

Цяпер жа пачынаецца новая хваля “свінскай тэмы”, якая ахоплівае новыя рэгіёны. Канфлікты паміж сялянамі і мясцовымі чыноўнікамі пачалі ўзнікаць там, дзе іх, па ідэі, проста не магло быць. Узяць, да прыкладу, вёску Любкаўшчына Стаўбцоўскага раёна. Больш за 200 жыхароў тут сабраліся на сход і паставілі подпісы пад зваротам у абарону сваіх гаспадарак. Канфлікт разгарэўся пасля таго, як жыхары атрымалі загад мясцовых улад ліквідаваць свіней на прыватных падворках. Сяляне спасылаюцца на тое, што гэтае патрабаванне незаконнае, бо свінакомплекс знаходзіцца ад вёскі на адлегласці 6 кіламетраў 200 метраў. Іншымі словамі, у 5-кіламетровую каранцінную зону вёска не трапляе. Да таго ж свіней тут трымаюць у хлявах, іх выпасам ніхто не займаецца. Сяляне лічаць, што мясцовыя чыноўнікі папросту вырашылі перастрахавацца і адрапартаваць наверх пра выкананне плана. Маўляў, як у той прыказцы: лепш "пера", чым "неда". Але што для адных перастрахоўка, то для іншых — жыццё.



Наталля і Вячаслаў Урублеўскія

Жыхарка вёскі Наталля Урублеўская кажа: *“У нас свінка і парсючок. Мы іх трымаем для сябе, а не на продаж. Дый у нашай вёсцы ўсе так. Да свінакомплексу больш за пяць кіламетраў. Чаму мы павінны забіваць свіней?! Дык мала таго, да нас прыехалі і кажуць, што камбінат забярэ ў нас свіней па 18 тысяч рублёў за кілаграм. А потым у нашай краме наша ж мяса прадаюць па 37 тысяч, а лепшае — дык і па 50 тысяч рублёў. Гэта справядліва? Для чаго гэта ўсё робіцца?!”*

Муж Наталлі Вячаслаў мае інваліднасць, ходзіць з мыліцай, але працуе па гаспадарцы на роўных з жонкай. *“Нам прапанавалі гадаваць так званую альтэрнатыву. Кажуць, што можна разводзіць трусоў ці авечак. А каля нас недалёка ферма буйной рагатай жывёлы, а там жа можа быць эпідэмія бруцэлёзу, лейкозу ці яшчэ чаго, а з другога боку — птушкафабрыка, а там потым скажуць пра птушыны грып. І што нам рабіць?! У такой сітуацыі можам толькі разводзіць рукамі”.*

Загады знішчаць свіней гэтымі днямі атрымалі таксама жыхары Клімавіцкага і Талачынскага раёнаў. Новых выпадкаў захворвання не зафіксавана, тым не менш мясцовыя ўлады настойваць на знішчэнні свінога пагалоўя.

Ці ёсць у гэтым істотная неабходнасць? Мы папрасілі адказаць на гэтае пытанне ветэрынара **Аляксея Цюлькова:**

— Канешне, цяжка казаць без азнаямлення з дакументамі, бо ў кожным рэгіёне па-рознаму пазначаны межы. Але калі там няма эпідэміі чумы і свінакомплекс на адлегласці больш за 5 кіламетраў, то навошта тады знішчаць свіней на прыватных падворках?

Гэта нагадвае бяздумнае выкананне адпаведных загадаў мясцовымі чыноўнікамі. Не трэба кідацца ў розныя бакі, трэба цвяроза глядзець на сітуацыю, каб не нашкодзіць.

Тым часам жыхары вёскі Любкаўшчына накіравалі свой зварот з сабранымі подпісамі ў пракуратуру, каб там разабраліся і далі прававую ацэнку загадам адміністрацыі.

Любоў ЛУНЁВА.

АКТУАЛЬНАЯ ТЕМА

ЧТО ВОЛНУЕТ ЛЮДЕЙ: их размышления о насущном и будущем

Полгода назад гражданская кампания "Говори правду!", движение "За Свободу" и Партия БНФ выступили с инициативой проведения «Народного референдума». Затем к ним присоединились Белорусская социал-демократическая партия (Грамада), оргкомитет по созданию Партии свободы и прогресса и более 40 региональных неправительственных организаций.



Андрей Дмитриев

Юрий Губаревич

"Топ-десятка" стала хитом онлайна

Все лето и часть осени активисты ездили по регионам страны и встречались с населением, чтобы выяснить, какие проблемы сегодня волнуют людей больше всего. По результатам этих поездок через сбор специальных купонов во всех регионах страны, а также на основе анкетирования активистов организаций-участников кампании был составлен предварительный рейтинг 30 наиболее актуальных вопросов.

После обсуждения с независимыми экспертами, представителями общественности в прессе опубликовали топовую десятку. Она вызвала огромный интерес и резонанс: больше 100 тысяч просмотров только на портале TUT.BY — это абсолютный рекорд после информации о событиях на Площади-2010, аналогично эта тема стала лидирующей и на ведущем информационном сайте "Беларускія навіны".

Вот топ-десятка идей, проблем, вопросов, которые на сегодняшний день, судя по многочисленным мнениям, больше всего волнуют людей.

Их представляют и комментируют те, кто выдвинул идею-предложение о проведении референдума.

Первая тема — здравоохранение. Здесь предлагается очень важное новшество: в случае, если детям до 18 лет нужна какая-то операция либо лечение, которые наше государство предоставить не может, оно должно оплатить лечение ребенка там, где исцеление возможно. Мол, таким образом можно эффективно поспособствовать развитию здравоохранения и сложных медицинских технологий.

Вторая тема связана с выборами руководителей местной исполнительной власти. Встречаясь с людьми, активисты повсеместно спрашивали: «Считаете ли вы, что они должны избираться прямым голосованием граждан и иметь право распределять и формировать бюджет?»

Третья тема определилась после того, как проанализировали ответы граждан на вопрос: «Согласны ли вы, что правительство Беларуси должно сделать все необходимое для того, чтобы подписать соглашение о зоне свободной торговли с Европейским Союзом?».

Четвертый вопрос возник в результате общественного обсуждения такой проблемы, как ограничение возможности для одного лица занимать больше двух сроков пост президента Республики Беларусь.

Пятый вопрос «вызрел» из экономического блока. Авторы идеи насчет проведения референдума спрашивали у людей: «Согласны ли вы, что правительство должно принять необходимые меры для создания особых льготных условий для ведения своего дела, бизнеса не для иностранцев, а для белорусов, в том числе принять закон о малом и среднем бизнесе?» И получили множество положительных ответов.

Шестая проблема касается частной собственности. Без ее решения говорить о серьезном изменении в экономике сложно. В устах активистов партии и общественных движений вопрос звучал так: «Согласны ли вы, чтобы законодательно закрепить положение, что расходы на образование и здравоохранение не могут быть меньше 8% от ВВП по каждой из этих статей»? В нынешний Год экономии для всех очевидно, что именно эти сферы подпадают почему-то под экономию, а вот расходы на идеологию, на силовиков, на новое строительство и новые игрушки для чиновников не сокращаются.

Вопрос седьмой. Судя по рассуждениям людей, он может быть таким: «Согласны ли вы с тем, что в Беларуси не должно быть иностранных военных баз?»

Восьмой вопрос. Инициаторы идеи о проведении референдума спрашивали у людей: «Согласны ли вы с тем, что все программы, институты, бюджеты, которые финансируются за счет бюджетных денег, должны исчерпывающе и публично отчитываться о доходах и расходах, кроме случаев, охраняемых законодательством о военной и государственной тайне?» И получали убедительные ответы, что это очень важный аспект дальнейшего развития государства, повышения благосостояния народа.

Девятая тема, которая может стать предметом рассмотрения на возможном референдуме, — это об уважении государства к человеку. Во время кампании, которую проводили активисты, главное слово в общении с людьми было такое — «уважение». Многие, очень многие граждане говорили: «Нас не уважают, мы как пустое место, нас ни о чем не спрашивают, все за нас решают...» Отсюда вытекает ориентировочный вопрос: «Согласны ли вы, что решения, которые коренным образом влияют на судьбу и будущее страны или отдельного региона (в том числе китайский технопарк, АЭС, военные базы и т.п.), должны приниматься только через проведение референдума соответствующего уровня?» Нужно обязать власти советоваться с людьми, сделать человека тем главным, кто решает свое будущее.

Десятый вопрос. Когда активисты партии, гражданской кампании «Говори правду!», движения «За Свободу» «подбили бабки», то увидели, что есть резон вынести на суд народа вопрос в такой формулировке: «Согласны ли вы на изменения в Избирательном кодексе о том, чтобы кандидаты на выборах любого уровня могли направлять своих представителей в участковые комиссии как полноправных членов этих комиссий?»

В середине декабря список будет сокращен до пяти вопросов, они приобретут точные юридические формулировки. После чего начнется новый этап реализации идеи, связанной с возможным проведением референдума.

Ну а пока инициаторы ездят по стране, выступают в прессе — продолжают объяснять суть своей идеи. Люди видят за топовой десяткой самые разные, порой совершенно неожиданные аспекты социально-экономической, политической жизни страны. Граждане пытаются вместе с политиками разобраться в происходящем, увидеть с помощью возможного народного референдума путь, который может вывести страну и общество из тупика.

Вот наиболее типичные вопросы людей и ответы на них инициаторов идеи плебисцита — заместителя руководителя кампании «Говори правду!» **Андрея ДМИТРИЕВА** и заместителя председателя движения «За Свободу» **Юрия ГУБАРЕВИЧА**.



Нельга выключаць горшае, аднак лепей рыхтавацца да працы

— Няўжо вы сапраўды верыце, што ўлада дазволіць правесці "Народны рэферэндум"? (*Францішак, Полацк.)*

— Мы бачым іншае: як гэтая ўлада заўсёды, падкрэсліваем — заўсёды, пасуе перед большасцю. Калі рэферэндум сапраўды стане галоўнай ідэяй большасці, а менавіта з такой задачай мы сёння і выходзім, то цалкам магчыма, што рэферэндум адбудзецца. Выключаць гэтага нельга — да гэтага трэба рыхтавацца.

— Хутчэй за ўсё ўлады прыкладуць свае намаганні, каб вы не сабралі 450 тысяч подпісаў да прэзідэнцкіх выбараў. Што тады? (*Ганна Вяршыліна, Бабруйск.)*

— Наша ініцыятыва скіравана на тое, каб нарошчваць патэнцыял народнай падтрымкі да таго моманту, пакуль ён не рэалізуецца ў канкрэтныя дзеянні беларускіх улад па правядзенні агульнанацыянальнага плебісцыту.

— Скажите по правде: сможете собрать достаточно подписей для инициирования референдума? И что изменится, если он все же пройдет? (*Константин, Орша.)*

